*Тамковіч Юрый Валер’евіч*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*студэнт*

**На службе Вялікага Княства Літоўскага ў XV – першай палове XVI ст.: выбраныя біяграфіі ротмістраў**

Ротмістраў на службе Вялікага Княства Літоўскага ў XV – першай палове XVI ст. можна падзяліць як меней на дзве групы: ротмістры-замежнікі і ротмістры-мясцовыя.

У першую чаргу паспрабуем скласці агульны партрэт ротмістра-замежніка, так як яны пераважалі ў наёмным войску (па нашых падліках з 185 вядомых нам ротмістраў, 171 ці 92.47% былі замежнікамі). Калі казаць пра паходжанне ротмістраў, то скарыстаемся падлікамі Аляксандра Болдарава, які займаўся праблемай тэрытарыяльнага паходжання пяхотнікаў у польскім наёмным войску у першай палове XVI ст. Ён прыходзіць да высноў, што 68,45% наёмнікаў паходзяць з Польскага Каралеўства, астатнія – Сілезія, Чэхія, Венгрыя, Германія і г.д. [7, с. 123]. Сярод палякаў, амаль 40% прадстаўнікі Малапольшчы і 14,45% – з Рускага ваяводства [7, с. 123]. Зразумела, што гэта не дадзеныя па наёмных ротмістрах конных і пешых рот на тэрыторыі ВКЛ, але, памятаем, што наёмнікі ў ВКЛ – у асноўным польская наёмная сіла, па гэтаму пэўнае ўяўленне для сябе можна скласці.

Па сацыяльным паходжанні ротмістры, часцей за ўсё, былі шляхцічамі, аднак сярод іх сустракаліся і мяшчане. Так напрыклад, можна вылучыць Яна Калюша, які быў венграм. Ён пачаў служыць у 1494 г., а праз 10 год яго ўжо ўзгадваюць у Кароннай Метрыцы як двараніна з гербам “Цёлэк” [7, с. 162]. На тэрыторыі Княства ён згадваецца некалькі раз: у 1500 г. у Полацку, ў 1503 г. у Барысаве, акрамя гэтага ў польскім

войску ў 1504, 1506, 1507, 1508, 1509, 1518 і 1519 г. Як бачым гэты чалавек быў ветэранам і некалькі раз удзельнічаў у канфліктах на тэрыторыі ВКЛ. Аднак у асноўным замежнікі прыймалі удзел у адзінкавых выправах на тэрыторыі ВКЛ (±90%) і толькі меншасць былі удзельнікамі некалькіх кампаній.

Акрамя таго неабходна сказаць, што сярод ротмістраў былі людзі, якія стаялі вельмі блізка да вярхоўнай улады. Пра іх захавалася нашмат болей звестак, чым пра "простых" ротмістраў. Паспрабуем разглядзець біяграфіі некалькіх такіх людзей. Напрыклад Якуб Сэцыгнёўскі герба "Еліта". Гэты чалавек быў сынам Мікалая і Кацярыны з Алескіх. З'яўляўся старастам бускім, бурграфам кракаўскім, з 1494 г. быў прыдворным караля Яна Ольбрахта.

У гэтага каралеўскага двараніна была насычаная біяграфія. У 1489 г. ён згадваецца ў спісе наёмнікаў, а ў 1501 г. ёсць згадка пра яго роту ў Мельніку [2, с. 25;]. Прымаў удзел у літоўска-рускай вайне 1500–1503 гг., суправаджаў Аляксандра Ягелончыка падчас баявых дзеянняў, удзельнічаў у аблозе Смаленска. Да 1505 г. Якуб служыў пры вялікакняскім двары. У 1512 г. удзельнічаў у бітве супраць татар пры Лапушна. У 1513 г. адпраўлены з дэпутацкай місіяй у Малдавію. Праз год, у красавіку 1514 г., падчас руска-літоўскай вайны 1512–1522 гг., у спісах ротмістраў праходзіць Сецыгнёўскі, аднак без імя [4, с. 112–113]. Ён кіраваў ротай у 200 кавалерыстаў у наёмным войску Я. Свярчоўскага. У 1516 г. Сецыгнеўскі разбіў атрад татараў пад Зынкавым, адбіўшы ясыр. У наступным годзе Сецыгнёўскі адправіўся ў Канстанцінопаль, дамогшыся падаўжэння перамір'я з султанам Селімам I Грозным на тры гады. Падчас польска-прускай вайны 1519–1521 гг. камандаваў групай польскіх войскаў (гетман часовы) уВарміі. Тады яму былі дадзены шырокія паўнамоцтвы: радыкальная мера пакарання (відаць смяротнае пакаранне), ён павінен быў

сачыць за ўнутранай дысцыплінай і аглядаць зброю [7, с. 32]. Сецыгнёўскі быў удзельнікам аблогі Квідзына, абаронцам Лідзбарка ад войскаў Альбрэхта Гогенцолерна. Захаваліся звесткі, як у жніўні 1520 г. каля Рэшля нямецкая конніца напала на абоз польскіх войскаў і увяла вялікую колькасць коняў. У раёне дзейнічала група Сецыгнёўскага, якая складала 1500 польскіх вершнікаў і пяхотнікаў. Яны выправіліся ў пагоню, разбілі нападнікаў і вярнулі частку коняў [19, с. 147]. Дарэчы, у складзе польскіх войскаў дзейнічаў і вышэй згаданы Я. Свярчоўскі. Праглядзеўшы узельнікаў некаторых каманій можна пабачыць, што яны павінны былі добра ведаць адзін аднаго, бо змагаліся разам у шэрагу кампаній, яны – з’яўляліся “касцяком” каманднага складу наёмнай арміі.

У 1524 г. Сецыгнеўскі ваяваў з туркамі, якія ўварваліся ў рускія землі. А ў 1527 г. Ян Тарноўскі прызначыў Якуба Сецыгнеўскага камандзірам экспедыцыі ў Венгрыі, каб прыняць удзел у вайне паміж Янам Запольяй і Габсбургамі. У 1528 г. Сецыгнёўскі дзейнічаў як гетман наёмных войскаў (2000 чалавек) [17, с. 53]. Аднак у хуткім часе гетмана адклікалі з Венгрыі [7, с. 321]. Памёр прыкладна ў 1530 г.

Нельга не згадаць аднаго з самых знакамітых ротмістраў часу – Януша Свярчоўскага, які з’яўляўся кашталянам вісліцкім, старостай тэрэбоўлянскім, люблінскім, рапчыцкім. дыпламатычны прадстаўнік Польшчы ў Асманскай імперыі (ездзіў да султана Баязіда II у 1511 г.).

У якасці ротмістра Свярчоўскі ўпершыню згадваецца ў 1489 г. [4, с. 115]. Служыў у надворнай харугві Вялікага Князя Літоўскага. У 1508 г., падчас выправы войска Фірлея супраць маскавітаў, меў уласную кавалерыйскую роту. Падчас літоўска-рускай вайны 1512–1522 гг., у красавіку 1514 г. узначаліў польскае наёмнае войска (наёмны гетман), у першую чаргу кіраваў наёмнай кавалерыяй. Акрамя гэтага выставіў кавалерыйскую роту [4, с. 112-113]. Быў адным з галоўных камандзіраў

падчас Аршанскай бітвы. Пасля быў начале інтэрнацыянальнага наёмнага войска, якое няўдала штурмавала рускую крэпасць Апочка ў 1517 г.

З верасня 1520 г. змяніў Мікалая Фірлея – кіраўнік войскаў падчас польска-прускай вайны (гетман часовы) [7, с. 46]. У 1522 годзе быў прызначаны вайсковым дарадцай пры М. Любраньскім і А. Тэнчыньскім – намесніках, вялікага гетмана кароннага Мікалая Фірлея, які захварэў [17, с. 63]. Пазней удзельнічаў у Петрыкаўскім сойме, дзе заключаў умовы перамір'я з малдаўскімі пасламі. Памёр у 1530 г. у Любліне.

Вышэй мы вялі гаворку пра замежных ротмістраў з Польскага каралеўства, калі ж ўзяць мясцовых ротмістраў, то тут сустрэнем прадстаўнікоў самых вядомых родаў ВКЛ: Адзінцэвічы, Вішнявецкія, Гальшанскія, Тышкевічы, Пацы. Гэтыя людзі займалі розныя дзяржаўныя пасады на поўдні ВКЛ, некаторыя мелі там свае ўладанні, яны з’яўляліся палітычнай элітай Княства.

Разгледзім біяграфіі Тышкевічаў-ротмістраў. Першы з іх гаспадарскі дваранін Міхайла Тышкевіч – малодшы сын Тышкі (Цімафея) Каленіковіча, заснавальніка роду Тышкевічаў. Пасля віленскага сойма 1534 г. займаўся тым, што развозіў феадалам Валынскай зямлі лісты ад вялікакняскай канцылярыі пра збор срэбра [5, с. 215]. Быў дыпламатычным пасланнікам ВКЛ у Крымскім ханстве ў 1537 (1538) г. Жыгімонт Стары жадаў, каб ён дамовіўся з ханам Сахіб Гірэем аб вечным міры і хаўрусе ўзамен на дары. Перамовы зацягнуліся і ён вызваліўся толькі ў 1540 г. [5, с. 215]. Вялікіх зямельных уладанняў не меў – яму належала некалькі маёнткаў на тэрыторыі Беларусі і Слабодзішчы на Жытоміршчыне.

У 1552 г. пад Кіевам згадваецца конная рота пад кіраўніцтвам Тышкевіча, якая падпарадкоўвалася гаспадарскаму маршалку, старосце чаркаскаму і канеўскаму Васілю Тышкевічу (брат Міхаіла) [14, с. 99]. У той жа год ён згадваецца з ротай на Падоллі.

Другі прадстаўнік роду, да якога мы звернемся гэта сын Васіля Тышкевіча – Каленік Васільевіч Тышкевіч. У 1552 г. яго рота згадваецца разам з аддзелам ягонага дзядзькі Міхаіла [14, с. 99]. У адрозненні ад яго Каленік змог зрабіць кар'еру. У 1560 г. ён стаў старостам гомейскім і гаспадарскім маршалкам. Староствам і замкам гомельскім Каленік быў узнагароджаны за сваю службу на чале наёмнікаў на Падоллі. Акрамя гэтага ён быў дзяржаўцай радашкоўскім. Тышкевіч актыўна ўдзельнічаў з сваёй ротай у Лівонскай вайне. Яго імя згадваецца падчас баявых дзеянннняў у лівонскіх замках, пад Старадубам і Смаленскам [6, с. 60, 92, 163] . У 1567 г. Каленік згадваецца з 15 коннікамі ў перапісе войска [5, с. 235]. Пасля смерці бацькі ён атрымаў некаторыя ўкраінскія ўладанні.

Такім чынам, можна адзначыць, што гэтыя родзічы служылі ротмістрамі па некалькіх прычынах: 1) падняццё маёмаснага і грамадскага статуса; 2) магчыма абарона сваіх украінскіх маёнткаў.

Цікавай асобай быў Іван Іванавіч Ляцкі. То быў сын маскоўскага ваяводы, акольнічага І.В. Ляцкага, які перабёг у 1534 г. на бок Літвы. У 1554 г. Іван Іванавіч стаў ляснічым падляшскім [3, с. 118]. Пасля смерці бацькі ён стаў уладальнікам маёнткаў на захадзе Княства. Звесткі, якія аб іх захаваліся кажуць аб тым, што Іван Іванавіч займаўся судовымі цяжбамі, пашырэннем сваіх уладаняў і сямейнымі справамі. У 1552 г. ён згадваецца разам з Тышкевічамі, у якасці ротмістра [14, с. 99]. Праславіўся падчас Лівонскай вайны: у 1567 г. Іван Іванавіч са сваім атрадам здзейсніў набег на маскоўскія землі і мужна граміў сваіх былых суайчыннікаў [3, с. 121]. Памёр пан Ляцкі ў 1569 (1574) г. [3, с. 123].

Трэба прыгадаць і такую групу ваеннай эліты ВКЛ – як татары. У 1520 г. некалькі наёмных харугваў татар былі накіраваны на дапамогу палякам. Кім былі кіраўнікі гэтых атрадаў? Адным з кіраўнікоў быў Урус Улан Асанчуковіч – татарскі маршалак наваградскі (з 1506 году) з роду

князёў Уланаў і Багрынаў. Асанчуковічы былі трэцім па важнасці татарскім родам ВКЛ, займалі вышэйшыя пасады ў гродзенскай і навагрудскай татарскіх харугвах [18, с. 80]. Урус Улан вядомы са спісу 1506 г., па якому выконваў службу пры каралі ў Кракаве [8, с. 398]. У 1520 г. згадваецца як кіраўнік наёмнага татарскага атрада з 176 вершнікаў, які накіроўваўся з ВКЛ на падмогу палякам у вайне з Тэўтонскім ордэнам. Ягоны ўласны почат меў 8 коней [18, с. 78].

Вядомым татарскім вайсковым дзеячом быў Шахманцэр Касымавіч Рудніцкі. Паходзіў ён з заможнага роду татарскіх князёў Барынскіх, продкам якіх быў Чынгізхан, быў сынам Сеіт-Касыма Мінбулатавіча (памёр да 1524 г.). Касым быў родам з Перакопскай Арды, добра служыў вялікім князям Казіміру і Аляксандру. Ягоны сын у 1524 г. ажаніўся на дачцы Ахмета Улана Асанчуковіча і тым самым набывае вялікую частку вёскі Узанішкі. У наступным годзе ён дакупае ў Алішка Кадышкевіча вялікі палац, а праз год у таго ж Алішкі вёску Іванаўшчына [ 9, с. 275]. У попісе 1528 г. указаны з 3-ох конным почтам, акрамя гэтага ў сцяг багрынскі разам з братамі ім было выстаўлена 8 коней [18, с. 82]. Кіраваў гэтым сцягам ягоны стрый харунжы багрынскі Сейт-Джалял Мінбулатавіч. Праз год Шахманцэру даецца з скарба ВКЛ “6 коп грошеи а сукно парпянское” [15, с. 625]. На той час гэта быў малады чалавек. Захаваўся дакумент, напісаны ў чэрвені 1531 г. да татарскага царэвіча Азекбека ў якім вялікі князь піша аб просьбе Шахманцэра [12, с. 156]. Шахманцэр сцвярджаў, што з-за яго маладасці старэйшыя татары не даюць яму ніякіх пасадаў. Вялікі князь прыказаў даць яму месца маршалка татарскага наваградскага (былым маршалкам быў памерлы Урус Улан Асанчуковіч) і ў 1531 г. ён ім стаў. Па сцверджанні Ст. Думіна, у 1531 г. ён стаў маршалкам усіх татарскіх сцягаў [8, с. 398]. Як ротмістр удзельнічаў у

вайсковым паходзе палякаў на Малдавію (хоцімская выправа) у 1538 г. Кіраваў татарскім атрадам у 100 кавалерыстаў, сам меў почат у 15 коней.

У 1549 г. з родзічамі атрымоўвае прывілей на палац Нарэўка ў крэўскім павеце [9, с. 275]. Восенню 1549 г., падчас наезду крымскіх татараў на рускія землі Шахманцэр быў ротмістрам наёмным на службе гаспадарскай. Ён прыйшоў на дапамогу абложанаму татарамі ў Брацлаве Богушу Карэцкаму. Пасля зняцця аблогі, удзельнічаў у пагоні і пераможнай бітве з татарамі пад Ачакавам [13, с. 82]. У 1550 г. ён быў ужо каралеўскім дваранінам, а праз два гады ён згадваецца пад Кіевам са сваёй ротай, якая падпарадкоўвалася Васілю Тышкевічу [10, с. 99]. Памёр каля 1554 г. [9, с. 275].

У 1541 г. гаспадарскі дваранін, пан Ян Завіша падаў "дэкрэт" на Шахманцэра, маўляў той не па праву валодае маёнткам Мерач (Merkinė), які належаў ягонаму цесцю. Шахманцэр жа, адказвае, што той маёнтак ім быў набыты ў татарына Алышкі Кадышэвіча [13, с. 86]. У 1546 г. згадваецца ягоная спрэчка з гаспадарскім баярынам Валянцінам Лігоцкім [11, с. 65].

Такім чынам, можна сказаць, што жыццё ротмістра на службе можна рэканструяваць, збольшага, на аснове біяграфій прадстаўнікоў багатых родаў ці людзей, якія шматкроць удзельнічалі ў вайсковых канфліктах і былі вядомымі вайскаводамі. Пра астатніх, нажаль, шмат інфармацыі не захавалася.

**Літаратура.**


1. *Бохан, Ю.М. Вайсковая справа ў другой палове XIV – канцы XVI стст. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2008. – 448 с.*
2. *Бохан, Ю.М. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2004. – 92 с.*

*3. Ерусалимский, К. Ю. На службе короля и Речи Посполитой. – Москва: Санкт-Петербург: Нестор-История, 2018. – 1010, [1] с.*

*4. Лобин, А.Н. Битва под Оршей 8 сентября 1514 года. – Санкт-Петербург: Общество памяти игумени Таисии, 2011. – 251 с.*

*5. Статкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш: Корсакі гербаў "Корсак" і "Ліс". Геталты, Тышкевічы, Гарабурды і Гарнастаі з роду Каленікавічаў Мішкавічаў. Рэуты герба "Газдава". – Мінск: Рэдакцыя часопіса "Роднае слова", 2017. - 574, [1] с.*

*6. Янушкевіч, А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг.: манаграфія. – Мінск: Медисонт, 2007. – 353 с.*

*7. Bołdyrew, A. Piechota zaciężna w Polsce w pierwszej połowie XVI wieku. – Warszawa: Neriton, 2011. – 419 s.*

*8. Borawski, P. Ziemska służba wojskowa Tatarów Wielkiego Księstwa Litewskiego w XV–XVII wieku. – Tarnowskie Góry: Wydawnictwo inforteditions, 2015. – 431 s.*

*9. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce / oprac St. Dziadulewicz. – Wilno, 1929. – 495 с.*

*10. Lesmaitis, G. Wojsko zaciężne w Wielkim Księstwie Litewskim w końcu XV – drugiej połowie XVI wieku. – Warszawa: Neriton, 2013. – 204 s.*

*11. Lietuvos metrika. [Kn. 234] : (1546–1548). 19-oji Teismų bylų knyga : (XVI a. pabaigos – XVII a. pradžios kopija) / Vilniaus universitetas. LII leidykla. Vilnius, 2009. – XXXIV, 287, [1] с.*

*12. Lietuvos metrika. Kn. 17: (1530–1536). Užrańytų knyga 17 / parengė Laimontas Karalius, Darius Antanavičius (tekstai lotynų kalba). – Vilnius: LII leidykla, 2015. – XLVI, 705 с.*

*13. Lietuvos metrika. Kn. 27: (1541–1542). 27-oji Užrańytų knyga / [parengė: Irena Valikonytė, Tomas Čelkis, Lirija Steponavičienė]. – Vilnius : Vilniaus universiteto leidykla, 2016. – XXX, 291 с.*

*14. Lietuvos metrika. Kn. 37: (1552–1561). Užrańymų knyga 37 / parengė Darius Baronas. – Vilnius: LII leidykla, 2011. – 632 c.*

*15. Lietuvos metrika. Kn. 7: (1506–1539). Užrańymų knyga 7 / parengė: Inga Ilarienė, Laimontas Karalius, Darius Antanavičius. — Vilnius: LII leidykla, 2011. – XXIX, 1010 c.*

*16. Dwór Litewski Wielkiego Księcia Aleksandra Jagiellończyka (1492–1506) // Lietuvos valstube XII–XVIII a. – Vilnius, 1997. – S. 78–130.*

*17. Plewczyński, M. Naczelne dowództwo armii koronnej w latach 1501-1572 // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. – 1992. – T. XXXIV. – S. 34–57*

*18. Plewczyński, M. Ludzie Wschodu w wojsku ostatnich Jagiellonów. – Warszawa: Wydawnictwo Bellona, 1995. – 165, [2] s.*

*19. Tyszkiewicz, J. Tatarzy w Polsce i Europie. Fragmenty dziejów. – Pułtusk, 2008. – 264 s.*